

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 13 (168) 30 КРАСАВІКА 1991 ГОДА


## АБ ПРАЕКЦЕ ДАГАВОРА

19.04.91 адбыўся сход працоўнага калектыву матфака, на якім абмяркоўваўся праект Працоўнага дагавора на 1991 год. Пры абмеркаванні ўлічвалася даволі складаная сацыяльная абстаноўка, у якую трапіла значная частка супрацоўнікаў універсітэта ў выніку рэзкага павышэння цэн. У сувязі з гэтым праект Працоўнага дагавора разглядаўся калектывам як дакумент, які дазваляе зафіксаваць дадатковыя, у адносінах да дзейнічаючага заканадаўства, правы калектыву работнікаў універсітэта ў іх узаемаадносінах з адміністрацыяй.

Аднак, у выніку абмеркавання было вызначана, што праект Дагавора, які прапануецца, у многім дэкларатыўны, пацвярджае ў асноўным правы, якія адміністрацыя ўжо мае, а таксама дае ёй дадатковыя рычагі ўздзеяння на супрацоўнікаў універсітэта. У той жа час дадатковыя правы, якія дае работнікам універсітэта Дагавор, вельмі нязначныя, адсутнічаюць рэальныя механізмы рэалізацыі гэтых правоў і метады грамадскага кантролю за іх выкананнем. Недастаткова асветлена пытанне ўмацавання сацыяльнай абароны работнікаў у сувязі з умовамі жыцця, якія значна змяніліся. Таму відавочна, што Праект патрабуе значнай дапрацоўкі, што малаверагодна, улічваючы вельмі позні тэрмін яго публікацыі.

Тым не менш, пры абмеркаванні Праекта выявіліся некаторыя балючыя пытанні эканамічнага і сацыяльнага плану, на якія калектыў палічыў сваім абавязкам адрэагаваць неадкладна.

**1. Матэрыяльнае стымуляванне.**

Калектыў факультэта не згодны з прапановай стымуляваць працу работнікаў універсітэта, якія асабліва вылучыліся, прадстаўленнем ім ільгот на набыццё тавараў павышанага попыту, асабліва, калі для гэтых мэт будуць выкарыстоўвацца аўтамабілі і кватэры (арт. 3.2 раздзел III). Лічыць неабходным праводзіць матэрыяльнае стымуляванне работнікаў універсітэта, якія асабліва вылучыліся, толькі шляхам грашовых выплат, а ўсе тавары павышанага попыту рэалізоўваць выключна ў парадку існуючай чарговасці.

**2. Жыллёва-бытавыя ўмовы.**

Калектыў факультэта лічыць незаконнымі прапановы, змешчаныя ў арт. 5.3, 5.4 раздзела пятага Праекта. Гэтыя артыкулы дазваляюць адміністрацыі універсітэта па вельмі неакрэсленых крытэрыях даваць кватэры ў доме, які будуецца на вул. Горкага, асобам, якія не маюць права (па існуючаму заканадаўству) на пастаноўку на чаргу. Названыя артыкулы не толькі супярэчаць Жыллёваму кодэксу БССР і СССР, але, што самае галоўнае, іх рэалізацыя з'явіцца парушэннем правоў больш ушчэмленых у жыллёвых умовах супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта, якія жывуць у інтэрнатах, або маюць менш, чым 7 квадратных метраў жыллёвай плошчы на члена сям'і.

**3. Аплата працы.**

Калектыў факультэта лічыць абсалютна недастатковым аб'ём кампенсацый і плануемы ўзровень павышэння заработнай платы для супрацоўнікаў вышэйшых навучальных устаноў і лічыць, што гэта пытанне зусім не адлюстравана ў Праекце. Увядзенне 12% або нават 24% надбавак асобным катэгорыям супрацоўнікаў не можа разглядацца ў сучасных ... дзейсная мера сацыяльнай абароны.

**4. Праца ў шкодных умовах.**

Калектыў факультэта не згодны з тым, што супрацоўнікі і выкладчыкі кафедраў факультэта, якія сістэматычна працуюць за дысплеямі ЭВМ, не аднесены да катэгорыі асоб, якія працуюць у шкодных умовах, хоць у загадзе № 579 Дзяржкамітэта СССР ёсць адпаведны від работ — «Работа за дысплеямі ЭВМ».

Аднагалосна прынята рашэнне аб мэтазгоднасці ўключыць супрацоўнікаў і выкладчыкаў кафедры факультэта, якія сістэматычна працуюць за дысплеямі ЭВМ, у спіс асоб, якім у адпаведнасці з загадам Дзяржкамітэта СССР па народнай адукацыі № 579 ад 20.08.90 належыць 12% даплата за шкодныя ўмовы працы. Накіраваць у экспертную камісію універсітэта па ацэнцы ўмоў працы супрацоўнікаў адпаведнае прадстаўленне. Улічваючы тыя факты, што першапачатковы этап работы камісіі праходзіў без удзелу супрацоўнікаў факультэта, а таксама тое, што ва універсітэцкай экспертнай камісіі адсутнічаюць спецыялісты па камп'ютэрнай тэхніцы, арганізаваць на факультэце групу з прафоргаў кафедраў для забеспячэння галоснага рашэння пытання.

У выніку былі аднагалосна прыняты наступныя прапановы па праекту Працоўнага пагаднення.

**Прапановы калектыву матэматычнага факультэта:**

1. Уключыць супрацоўнікаў і выкладчыкаў кафедры факультэта, якія сістэматычна працуюць за дысплеямі ЭВМ, у спіс асоб, якім у адпаведнасці з загадам Дзяржкамітэта СССР па народнай адукацыі № 579 ад 20.08.90 належыць 12% даплата за шкоднасць.

2. Распаўсюджваць даплату за шкодны характар працы таксама і на сумяшчальнікаў.

3. Выключыць з Праекта артыкул 3.2 раздзела III. Лічыць мэтазгодным рабіць матэрыяльнае стымуляванне толькі шляхам грашовых выплат, а ўсе тавары павышанага попыту рэалізоўваць толькі па чарзе.

4. Спыніць любую практыку льготнага размеркавання тавараў павышанага попыту, асабліва аўтамабіляў і кватэр.

5. Абавязаць рэктарат праводзіць усе віды фінансавага заахвочвання не за кошт скарачэння фонду заработнай платы.

6. Выключыць з Праекта артыкулы 5.3, 5.4 як незаконныя і парушаючыя правы іншых супрацоўнікаў універсітэта.

7. У сувязі з недастатковым аб'ёмам кампенсацый прызнаць неабходным увесці частковую кампенсацыю на харчаванне ў сталовай універсітэта, асабліва нізкааплачваемым супрацоўнікам і выкладчыкам.

8. Аплачваць выкладчыкам, якія пераязджаюць для правядзення заняткаў паміж карпусамі універсітэта, месячныя праязныя білеты.

9. Прафкаму універсітэта своечасова інфармаваць калектывы структурных падраздзяленняў аб паступаючых загадах і пастановах, якія звязаны з сацыяльна-эканамічнымі і бытавымі аспектамі.

10. Пры распрацоўцы палажэння аб аказанні матэрыяльнай дапамогі работнікам універсітэта закласці палажэнне, па якому выплаты буйных памераў (на будаўніцтва індывідуальных дамоў і ЖСК) павінны аказвацца ў першую чаргу малааплачвае-

## С А С В Я Т А М!



# СПОРТ ✦ СПОРТ ✦ СПОРТ







## НА СПАРТАКІЯДЗЕ УНІВЕРСІТЭТА

### СТРАЛЬБА КУЛЯВАЯ

Першае агульнакамандное месца заваявалі студэнты філалагічнага факультэта — 328 ачкоў. На другім месцы студэнты матэматычнага факультэта — 320 ачкоў, на трэцім — гісторыкі — 320 ачкоў.

У асабістым заліку першае месца заняла студэнтка II курса 5 групы філалагічнага факультэта Святлана Грыбанава. Другое месца ў студэнта гістарычнага факультэта Валерыя Ляховіча, трэцяе месца заняў студэнт матэматычнага факультэта Сяргей Першукевіч.

### ВАЛЕЙБОЛ

Каманда факультэта фізічнай культуры на Спартакіядзе атрымала перамогу ва ўсіх сустрэчах, але яна выступала па-за спаборніцтвамі. Таму ў рашаючай гульні сустрэліся каманды фізічнага і юрыдычнага факультэтаў. Ва ўпартай барацьбе фізікі вырвалі перамогу ў трэцяй заключнай партыі 17:16 і заваявалі галоўны прыз. Другое месца ў юрыстаў. Трэцімі сталі прадстаўнікі матэматычнага факультэта.

### ФУТБОЛ

У фінале за I месца сустрэліся прадстаўнікі факультэта фізічнай культуры і матэматычнага факультэта. З мінімальным лікам 1:0 перамогу святкавалі студэнты факультэта фізічнай культуры. Трэцяе месца заняла каманда фізічнага факультэта, якая згуляла ў фінале за III месца ўнічыю 0:0 са зборнай юрыдычнага факультэта.

НА ЗДЫМКАХ: пераможца Спартакіяды, зборная каманда фізічнага факультэта па валейболу; граматы і прызы ўручаюцца капітану зборнай каманды факультэта фізічнай культуры па футболу; пераможца Спартакіяды, зборная каманда факультэта фізічнай культуры па футболу; віншаванні прымае лепшы стралок Святлана Грыбанава.

ФОТА: М. Бандарэнкі.




## ПАДПІСКА-91

**Апошнія падзеі грамадска-палітычнага характару**
**Навіны гарадскога жыцця**
**Аналіз сацыяльна-эканамічнай сітуацыі**
**Меркаванні гаражан па самых розных пытаннях**
**«Белыя плямы» гісторыі**
**Дэтэктыўныя аповесці**
**Разнастайную інфармацыю: ад запрашальнага білета да праграмы тэлебачання**
**Рэкламу**
**Зможаце чытаць вы кожную сераду і суботу, калі падпішацеся на гарадскую грамадска-палітычную газету «24 часа»**
**Падпісная цана: з 1 чэрвеня да канца года — 7 руб., на месяц — 1 руб.**
**Падпісны індэкс 63939**
**Выпісвайце і чытайце газету «24 часа».**



Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404, тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Аб 'ём газеты — адзін друкаваны аркуш

Газета надрукавана афсетным спосабам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 16.00.
1 т.2000

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА, ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ, ПАРТКАМ, ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

С. М. ЛАЎНІК